







Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

# Поспеху вам, абітурыенты!

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

У краіне працягваюцца ўступныя выпрабаванні. 28 ліпеня намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка наведаў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, дзе азнаёміўся з ходам уступных выпрабаванняў у абітурыентаў. "Уступная кампанія працягваецца. З учарашняга дня пачаліся іспыты ў трох творчых вышэйшых навучальных установах: Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У нас пабудавана цэнтралізаваная сістэма бесперапыннай падрыхтоўкі спецыялістаў творчых прафесій. Па ўсёй краіне дзейнічаюць больш за 400 дзіцячых школ мастацтваў, дзе займаюцца звыш 120 тыс. чалавек, 20 каледжаў, дзе адпаведныя спецыяльнасці атрымліваюць каля 4,9 тыс. юнакоў, а таксама тры вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе ў агульнай складанасці рыхтуюць парадку 4,8 тыс. спецыялістаў.



Для нас вельмі важна развіваць уласную культуру, знаходзіць творчых людзей і дапамагаць ім у атрыманні сур'ёзнай адукацыі, а таксама ў далейшай творчай рэалізацыі ў прафесіі", — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.





ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").